У святле падзей трагічных і слаўных...

СТАР. 3

Камп'ютары выцясняюць тэлевізары

СТАР. 3

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 САКАВІКА 2014 г. ПЯТНІЦА № 57 (27667) Кошт 2100 рублёў

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

СПАДЗЯВАЦЦА НА ЎЛАСНЫЯ СІЛЫ

На працягу трох гадоў імпарт гідраўлічнага абсталявання будзе цалкам замешчаны айчыннай вытворчасцю

Аб гэтым Прэзідэнту Аляксандру Лукашэнку было даложана падчас наведвання ў Дзяржынску ТАА «Салео», дзе арганізавана вытворчасць гідраўлікі, паведамляе БЕЛТА.

Фота БЕЛТА.

Як далажылі кіраўніку дзяржавы, прадпрыемства створана на плошчах Дзяржынскага маторарамонтнага завода. Заснавальнікамі гаспадарчага таварыства выступілі таварыствы «Інтэрсэрвіс» і «ПМВ Інжынірынг». Новымі ўласнікамі рэалізуецца інвестпраект па арганізацыі гідраўлічнай вытворчасці, які ўключае два этапы. З кастрычніка 2013 года прадпрыемства пачало серыйны выпуск імпартазамяшчальнай прадукцыі і выйшла на вытворчую магутнасць. Агульны аб'ём інвестыцый складзе больш за $200 млн, акупнасць праекта — 5 гадоў.

Старшыня савета дырэктараў ААТ «Амкадор» — кіруючая кампанія холдынга» Аляксандр Шакуцін падкрэсліў, што прадпрыемства ў Дзяржынску атрымалася вывесці на праектную магутнасць усяго за паўгода, у той час як на падобных прадпрыемствах у заходніх краінах на гэта часам трацілца да двух гадоў. Ужо сёлета мяркуецца выканаць другі этап праекта, заключаны адпаведны інвестдагавор з Мінаблвыканкамам. Плануецца паставіць 28 адзінак абсталявання на суму $21,3 млн.

Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з тэхналагічным працэсам вытворчасці сучаснага гідраўлічнага абсталявання, агледзеў вытворчыя памяшканні прадпрыемства, выстаўку прадукцыі. Кіраўнік дзяржавы таксама пагутарыў з прадстаўнікамі працоўнага калектыву ТАА «Салео». «Без вас гэта было б немагчыма. Вы вельмі хутка і аператыўна стварылі гэты завод», — падкрэсліў Прэзідэнт, звяртаючыся да прысутных.

Кіраўнік дзяржавы асабліва адзначыў імпартазамяшчальны эфект ад стварэння новай вытворчасці, што дазволіць сэканоміць значныя аб'ёмы валютных сродкаў. «Тое, што я бачу, абсалютна не адрозніваецца ад лепшых сусветных узораў. Гэта сапраўды сусветны ўзровень. Малайцы! Гэта тое, што нам сёння трэба», — ацаніў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу на развіццё гарадоў — спадарожнікаў Мінска, у тым ліку Дзяржынска. «Тут будзе магутная вытворчасць. Ніхто Мінск больш не будзе разбудоўваць. Мы будзем будаваць у спадарожніках, і, натуральна, сюды будуць перамяшчацца людзі», — сказаў ён.

Падчас рабочай паездкі Прэзідэнта ў Мінскую вобласць размова таксама ішла аб сацыяльна-эканамічным развіцці рэгіёна і ходзе вясенне-палявых работ. Прэзідэнт цікавіўся тым, наколькі эфектыўна працуюць прадпрыемствы вобласці, як вядзецца работа па скарачэнні складскіх запасаў.

Старшыня Мінаблвыканкама Сямён Шапіра падрабязна расказаў аб работах у сельскай гаспадарцы, аб праблемных пытаннях. «Хачу, каб вы ўсе мелі на ўвазе, што сёлета ніхто вам грошай не дасць, як у мінулыя гады. Толькі пад нейкія праекты, якія зацікавяць дзяржаву. І не толькі таму, што ў свеце сітуацыя такая, — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка. — Пачынайце працаваць і лічыць выдаткі. Усё, што вы зробіце, прадасце, — дзяліце. Думайце, як вы будзеце жыць і, калі трэба, нават выжываць, але толькі дзякуючы ўласным сілам».

ДА ВЕДАМА ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Чацвёртая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання пачне сваю работу **2 красавіка 2014 года ў 10.00** у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом урада, Авальная зала).

Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца **2 красавіка 2014 года з 9.00 да 9.50** у фае залы пасяджэнняў.

ЗАЛЕСКІЯ ГАСЦІНЦЫ

Вёска Залессе — самая далёкая кропка на шляху аўтакрамы філіяла Пружанскага райпа «Колас», дзе працуе Людміла Несцяровіч. І самая маланаселеная — усяго з двума жыхарамі, а дакладней жыхаркамі — Валянцінай Сіплівай і Марыяй Сіплівай. Але тройчы на тыдзень крама на колах абавязкова прыпыняецца на залескай вуліцы каля лавы, на якой у добрае надвор'е любяць пасядзець неразлучныя суседкі. Прадуктовых тавараў у краме вялікі выбар — будзе задаволены любы пакупнік. І прадавец ведае, што пенсіянерам гэта таксама даспадобы: рыба трох відаў, 15 гатункаў каўбасы, птушка розных катэгорый, хлебабулачныя вырабы і малочныя прадукты, садавіна, гародніна, кандытарская смаката...

Зрабіўшы пакупкі, бабулі прысаджваюцца на лаве, чакаюць, калі да іх прысядзе і прадавец: трэба ж і слоўцам перакінуцца.

— Яна добрая і ўважлівая да нашых патрэб, — кажуць залескія пенсіянеркі пра Людмілу Несцяровіч. — Чакаем яе як родную і хочам парадаваць якім-небудзь пачастункам. Ведаем, што праца ў яе нялёгкая, а шлях да райцэнтра няблізкі.

Гэтым разам Валянціна Парфёнаўна і Марыя Лук'янаўна насмажылі дранікаў і дружна частавалі імі, гарачымі і духмянымі, любімую загадчыцу перасоўнай крамы.

Анатоль КЛЯШЧУК, Фота аўтара.

ЦЫТАТА ДНЯ

Пётр ПРАКАПОВІЧ, намеснік прэм'ер-міністра:

«У краіне ўжо склаўся цэлы клас салідных бізнесменаў. Мы павінны дапамагчы ім ствараць больш новых прадпрыемстваў і вытворчасцяў і тым самым ствараць новую беларускую эканоміку. Калі казаць аб праблемах, якія перашкаджаюць развіццю малога і сярэдняга бізнесу ў Беларусі, то трэба адзначыць, што галоўнай перашкодай з'яўляецца недаступнасць крэдытаў у беларускіх рублях. Сёння гэта звышдарагія, спекулятыўныя крэдыты, яны не дазваляюць малым прадпрыемствам развівацца. Гэтую праблему трэба вырашаць больш хуткімі тэмпамі, чым вырашаем цяпер. Трэба, каб кошт крэдыту быў рынкавы, увязаны з узроўнем інфляцыі. Калі інфляцыя складае 15-16%, то стаўкі па крэдытах не павінны перавышаць 20%. Сёння яны ў два разы вышэй. Гэта штучнае перавышэнне».

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 28.03.2014 г.

Долар ЗША	9860,00	▲
Еўра	13580,00	▼
Рас. руб.	277,00	▲
Укр. грыўня	897,18	▼

УКРАІНСКАЕ ЗАБАЛАЦЦЕ ЖЫВЕ, ЯК РАНЕЙ

■ Цераз мяжу

Карэспандэнтка «Звязды» пабывала ў памежным украінскім пасёлку Валынскай вобласці — месцы традыцыйнага шопінгу брастаўчан

Дызель-цягнік Брэст — Забалацце з савецкіх часоў ходзіць некалькі разоў на дзень. Апошнія гады жыхары аблас-

Фота Святланы ЯСКЕВІЧ.

нога цэнтра, а таксама Маларыты, навакольных вёсак ездзілі за мяжу рэгулярна, каб зарабіць нейкую капейку на розніцы цэн. Год таму гэты цягнік перавозіў у суседнюю Украіну тоны малочнай прадукцыі з Беларусі: з Брэстчыны везлі смятану, масла, згушчанае малако, тварог. Цяпер, калі ў нас цэны падраслі, ніхто не вязе прадукты, прынамсі, у вагоне на шляху ва Украіну не было ніводнага чалавека з таварам. Ад суседзяў жа вязуць цукеркі і пячэнне, грэчку, алей, посуд, адзенне па банальнай прычыне — там гэта танней, чым у нас.

Рынак ва ўкраінскім Забалацці — гэта асобная размова. Пра яго скажу ніжэй. Але адразу зазначу, што два разы на тыдзень — у аўторак і суботу — рынак арганізуецца спецыяльна для нас, беларусаў. У Забалацце, на мяжу, з'язджаюцца гандляры з навакольных украінскіх райцэнтраў і разгортваюць партатыўныя палаткі, займаюць адразу некалькі вуліц.

Раней я ніколі не бывала ў Забалацці, хоць яно размешчана ўсяго ў нейкіх 60 кіламетрах ад Брэста. А цяпер проста захацелася паглядзець, як жывуць суседзі, які адгалосак маюць падзеі апошніх месяцаў у звычайным пасёлку. Мяне падтрымалі дзеці, тым больш што іх аднакласнікі часта наведваюць Украіну выключна з мэтай шопінгу.

СТАР. 3

■ Надвор'е

ІСТОТНА ПАСВЯЖЭЕ

У выхадныя ўначы да 6 градусаў марозу

Мінулая дэкада была анамальна цёплай для гэтых дзён сакавіка. Так доўга падобная цеплыня на значнай частцы тэрыторыі Беларусі не фіксавалася ні разу за больш чым стагадовы перыяд назіранняў, паведамілі рэдакцыі сіноптыкі Рэспубліканскага гідраметэацэнтра.

Аднак ужо сёння сітуацыя пачала мяняцца. Павольна, пачынаючы з паўночнага ўсходу Беларусі, у наш бок рухаецца халодны антыцыклон з цэнтрам над Фінляндыяй. Таму ападкаў не чакаецца. Вецер паўночна-ўсходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 0 да плюс 6 градусаў, па паўночным усходзе Віцебскай і Магілёўскай абласцей — 1-3 градусы марозу. Удзень паветра прагрэецца да 7-13 градусаў вышэй за нуль, а па паўднёвым захадзе — да плюс 15 градусаў.

У выхадныя антыцыклон цалкам «накрые» нашу краіну і сур'ёзна пахаладае. Істотных ападкаў не чакаецца. Тэмпература паветра ўначы будзе ад мінус 6 градусаў па паўночным усходзе, да плюс 2 — па паўднёвым захадзе краіны. Удзень чакаецца 4-9 градусаў цяпла, а па захадзе Брэсцкай і Гродзенскай абласцей — 10-13 градусаў вышэй за нуль.

У апошні сакавіцкі дзень чакаецца паступленне на Беларусь свежых і ўжо вільготных паветраных мас з поўначы Балтыйскага мора. Месцамі пройдуць кароткачасовыя ападкі, пераважна ў выглядзе мокрага снегу. Уначы і раніцай на асобных участках дарог прагназуецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад мінус 4 да плюс 2 градусаў, удзень — ад 2 да 8 градусаў цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў, у сярэдзіне наступнага тыдня захаваецца халаднаватае надвор'е. У сераду тэмпература паветра ўначы ў розных раёнах рэспублікі будзе ад мінус 7 да 0 градусаў, удзень — 2-8 цяпла. У асобных раёнах пройдзе невялікі снег.

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ГАЗ ДЛЯ НАСЕЛЬНІЦТВА УКРАІНЫ ПАДАРАЖЭЕ Ў ПАЎТАРА РАЗА

Цэны на газ для насельніцтва Украіны з 1 мая 2014 года вырастуць у паўтара раза. Пра гэта паведамляе агенцтва УНІАН са спасылкай на прадстаўніка «Нафтагаза Украіны» Юрыя Калбушына. Паводле яго слоў, таксама плануецца на 40 працэнтаў павысіць тарыфы на газ для прадпрыемстваў «Цеплакамунэнерга», аднак іх гэтыя меры закрануць крыху пазней — з ліпеня 2014 года. Канчатковыя паказчыкі павышэння тарыфаў будуць адлюстраваны ва ўрадавай пастанове з графікам (ён будзе апублікаваны ў бліжэйшы час) павышэння цэн да 2018 года. Як адзначае агенцтва Reuters, на такі крок улады Украіны пайшлі па патрабаванні Міжнароднага валютнага фонду, з якім Кіеў вядзе перамовы аб выдзяленні чарговага траншу фінансавай дапамогі ў 15-20 мільярдаў долараў. Чакаецца, што павышэнне тарыфаў на газ справакуе рэзкую незадаволенасць насельніцтва. Раней прадстаўнік прэзідэнта Расіі Дзмітрый Пяскоў паведаміў аб спыненні для Украіны газавай зніжкі, абумоўленай харкаўскімі дагаворамі ад 2010 года. Яны прадугледжвалі зніжку на газ для Украіны ў абмен на падаўжэнне тэрміну знаходжання Чарнаморскага флоту РФ у Крыме. Паводле слоў Пяскова, пасля далучэння Крыма да Расіі газавая зніжка для Украіны не дзейнічае «ні дэ-юрэ, ні дэ-факта».

ПАРТЫЯ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ БРЫТАНІІ АББВІНАВАЦІЛА ЕС У ПРАВАКАВАННІ ГВАЛТУ ВА УКРАІНЕ

Кіраўнік набіраючай папулярнасць у Вялікабрытаніі Партыі незалежнасці Найджэл Фараж лічыць, што Еўропа дала марную надзею жыхарам заходняй Украіны, якія з-за гэтага зрынулі ўрад. «Я думаю, ва Украіне рукі Еўрасаюза ў крыві. Я не хачу ўмяшання еўрапейскай арміі, ваенна-марскіх ці ваенна-паветраных сіл або еўрапейскай дыпламатыі. Гэта не будзе добрым рашэннем», — сказаў Фараж падчас палітычных дэбатаў з лідарам ліберальных дэмакратаў, віцэ-прэм'ерам Нікам Клегам. Лідара Партыі незалежнасці на дэбатах падтрымалі 57% гледачоў. Раней абвінавачванні ў адрас Еўрасаюза гучалі з боку Расіі. Кіраўнік МЗС РФ Сяргей Лаўроў адкрыта заяўляў, што ўкраінскі пратэстны рух фінансуецца з-за мяжы.

ЧАСТАЕ ЎЖЫВАННЕ СПІРТНОГА ГЭТАК ЖА НЕБЯСПЕЧНА, ЯК І ВЯЛІКІЯ АБ'ЁМЫ

Частае ўжыванне спіртнога павышае рызыку смерці ад ішэмічнага інсульту ў мужчын, перадае NDTV Cooks. Гаворка ідзе пра тыя выпадкі, калі чалавек выпівае часцей за два разы на тыдзень. Тады рызыка павышаецца больш чым у тры разы ў параўнанні з людзьмі, якія наогул не п'юць спіртнога. Такая выснова зроблена пасля 20-гадовага назірання за 2609 мужчынамі сярэдніх гадоў. Па словах супрацоўнікаў Універсітэта Усходняй Фінляндыі, рызыка кровазліцця ў мозг павышаецца лінейна па меры павелічэння ўжывання спіртнога: чым больш алкаголю — тым вышэй рызыка.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ДАНІЯ НАКІРОЎВАЕ ШЭСЦЬ ЗНІШЧАЛЬНІКАЎ У КРАІНЫ БАЛТЫІ

Данія накіроўвае шэсць знішчальнікаў F-16 у краіны Балтыі для патруляванне паветранай прасторы ў рэгіёне ў сувязі з украінскім крызісам, перадаюць інфармагенцтвы.

Адпраўка знішчальнікаў F-16 будзе ажыццёўлена згодна з планамі НАТА аб пашырэнні кантролю над паветранай прасторай у рэгіёне. Патруляванне будзе ажыццяўляцца з 1 мая і да канца жніўня 2014 года. Раней Францыя заявіла пра гатоўнасць накіраваць у прыбалтыйскія дзяржавы і Польшчу чатыры самалёты-знішчальнікі Rafale і Mirage-2000. Мэтай місіі павінен стаць кантроль над паветранай прасторай у рэгіёне. Акрамя таго, міністр абароны Румыніі заклікаў НАТА павысіць боегатоўнасць у краінах, якія мяжуюць з Украінай, і паведаміў пра паскоранае набыццё 48 знішчальнікаў F-16. Міністр адзначыў, што кампаненты супрацьракетнай абароны ЗША будуць устаноўлены ў Румыніі ў 2015 годзе, як і было прадугледжана.

КАРАТКА

Першы ў Паўднёва-Усходняй Азіі завод па зборцы беларускіх трактароў адкрыўся ў Камбоджы.

На час дзеяння ў Беларусі бязвізавага рэжыму ўезду ўдзельнікаў і гасцей чэмпіянату свету па хакеі плануецца ўстанавіць дзяжурства афіцэраў падраздзялення па грамадзянстве і міграцыі органаў унутраных спраў у асноўных пунктах пропуску на дзяржаўнай граніцы.

Сярод краін СНД па велічыні сярэднямесячнай заработнай платы ў доларавым эквіваленце Беларусь займала ў 2013 годзе трэцяе месца пасля Расіі і Казахстана. Зарплата ў мінулым годзе ў Расіі была роўная $941 у эквіваленце, у Казахстане — $714, у Беларусі — $573, у Азербайджане — $539, ва Украіне — $409, у Арменіі — $369.

У Расіі будзе створана нацыянальная плацежная сістэма.

Маскоўскі аэрапорт Шарамецева з 27 сакавіка знімае забарону на правоз вадкасцей на борце самалёта.

ДАРОГУ — ЭНЕРГЕТЫЧНАМУ ЭКСПЕРЫМЕНТУ!

На працягу апошніх 10 гадоў мы, жыхары Гомеля, атрымліваем дадатковы квіток на аплату ацяплення. Атрымальнік плацяжу пры гэтым — РУП «Гомельэнерга», а не ЖКГ, як у іншых рэгіёнах краіны. Якая розніца? Вялікая. Спажыванне цеплавой энергіі знізілася больш чым на чвэрць. Толькі таму, што выключаны пасярэднік. Гэтая інфармацыя прагучала на пасяджэнні рабочай групы па вывучэнні праблемных пытанняў у жыллёва-камунальнай гаспадарцы, якая прайшла на базе «Гомельэнерга». Грошы прадпрыемства атрымлівае хутчэй, а колькасць скаргаў ад насельніцтва істотна зменшылася. Эканомія складае 12 мільярдаў рублёў за год. Менавіта таму эксперымент у Гомелі прызнаны эфектыўным і можа быць распаўсюджаны на ўсю краіну.

Нагадаю, што напярэдадні, на сустрэчы са старшынёй КДК Аляксандрам Якабсонам, які ўзначальвае рабочую групу па вывучэнні праблемных пытанняў у жыллёва-камунальнай сферы, Прэзідэнт даручыў разабрацца ў рэальным кошце паслуг і выключыць неабгрунтаваных пасярэднікаў. Аляксандр Якабсон падкрэсліў, што сёння асноўная задача — не тарыфы рухаць, а скарачаць выдаткі на паслугі — у прыватнасці, бюджэтны складнік — за кошт больш рацыянальнага выкарыстання сродкаў.

СТАР. 2

Фота Ірыны АСТАШКЕВІЧ.

ISSN 1990 - 763X

ЛІКВІДУЮЦЦА ВАЕННЫЯ ПРАКУРАТУРЫ

Ваенныя пракуратуры ліквідуюцца ў Беларусі з 1 верасня. Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе Прэзідэнта Беларусі, адпаведны ўказ № 137 Аляксандр Лукашэнка падпісаў 26 сакавіка.

У адпаведнасці з дакументам з 1 верасня 2014 года будуць ліквідаваны Беларуская ваенная пракуратура і 11 міжгарнізонных ваенных пракуратур. Паўнамоцтвы па ажыццяўленні нагляду за выкананнем заканадаўства ва Узброеных Сілах, іншых войсках і воінскіх фарміраваннях Беларусі, дзяржаўных органах, у якіх прадугледжана ваенная служба, ускладаюцца на Генеральную пракуратуру і тэрытарыяльныя пракуратуры.

Рэарганізацыя накіравана на ўдасканаленне сістэмы органаў пракуратуры, аптымізацыю іх дзейнасці і скарачэнне штатнай колькасці.

Прыняцце ўказа дасць магчымасць зменшыць асігнаванні, што выдзяляюцца з рэспубліканскага бюджэту на ўтрыманне органаў пракуратуры, у 2014 годзе на Br1,285 млрд, у наступныя гады — на Br4,180 млрд штогод.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ НІКАСА САФРОНАВА З АДКРЫЦЦЁМ ВЫСТАЎКІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў заслужанага мастака Расійскай Федэрацыі Нікаса Сафронава з адкрыццём выстаўкі яго твораў у беларускай сталіцы. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

«Вашы талент, энергія і вера ў сябе знайшлі сваё ўвасабленне ў сотнях палотнаў, якія з'яўляюцца часткай культурнага здабытку Расіі, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Мы цэнім Вас як аднаго з выдатных прадстаўнікоў сучаснага мастацтва і добрага сябра Беларусі. Упэўнены, што Ваша дзейнасць і ў далейшым будзе садзейнічаць яднанню нашых народаў».

■ Будзь у курсе!

КРАСАВІЦКІЯ І МАЙСКІЯ СВЯТЫ ПАРУШАЦЬ ПРЫВЫЧНЫ РАБОЧЫ ГРАФІК БЕЛАРУСАЎ

Беларусы будуць працаваць у стандартным рэжыме да канца красавіка, потым звычайны рытм парушаць святы, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА. У гэтым годзе Вялікдзень адзначаецца 20 красавіка — супадае ў каталікаў і праваслаўных. Паводле календара праваслаўнай канфесіі Радаўніца, якая адзначаецца на дзявяты дзень пасля хрысціянскага свята, выпадае на 29 красавіка (аўторак). Праз дзень чырвоным днём календара пазначана 1 мая (чацвер).

У сувязі з гэтым беларускі ўрад вырашыў перанесці рабочы дзень з серады 30 красавіка на суботу 3 мая. Адпаведнае рашэнне змешчана ў пастанове Савета Міністраў ад 25 лістапада 2013 года № 1012.

У выніку канфігурацыя рабочых і выхадных дзён выглядае наступным чынам: спачатку тры выхадныя дні (29 красавіка — 1 мая), потым — два рабочыя (2-3 мая), пасля чаго — яшчэ адзін выхадны (нядзеля 4 мая) і чатыры рабочыя дні (5-8 мая). Потым беларусаў чакаюць яшчэ тры выхадныя (з 9 па 11 мая).

Суайчыннікі, якія не згубяцца ў выхадных і будных днях і прадоўжаць працаваць у панядзелак, 12 мая, акунуцца ў прывычны рытм да Дня Незалежнасці, які адзначаецца 3 ліпеня і выпадае на чацвер. Рабочы дзень з пятніцы 4 ліпеня пераносіцца на суботу 12 ліпеня, дзякуючы чаму атрымаюцца зацяжныя выхадныя.

Яшчэ адзін перанос сёлета запланаваны з нагоды каталіцкіх Каляд — з пятніцы 26 снежня на суботу 20 снежня.

Згодна з пастановай Саўміна, арганізацыям прадастаўлена права з улікам спецыфікі вытворчасці (работы) ажыццяўляць перанос рабочых дзён у іншым парадку ў адпаведнасці з заканадаўствам.

ДАРОГУ — ЭНЕРГЕТЫЧНАМУ ЭКСПЕРЫМЕНТУ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Генеральны дырэктар дзяржаўнага аб'яднання «Жыллёва-камунальная гаспадарка Гомельскай вобласці» Дзмітрый Згурскі гаворыць, што выключэнне пасярэдніка ў першую чаргу дазволіла навесці парадак у цеплазабеспячэнні жыхароў Гомеля:

— Істотна зменшылася спажыванне цеплавой энергіі. Гэта дало зніжэнне нагрузкі як для бюджэту, так і для грамадзян. Уся работа адбывалася ў звязцы энергазабяспечвальнай і жыллёвай арганізацый, якія вырашалі праблемы як на цеплакрыніцах, на сетках, так і ў жылым фондзе.

Яшчэ адзін плюс эксперыменту — памяншэнне колькасці зваротаў ад спажыўцоў, адзначае першы намеснік старшыні КДК Гомельскай вобласці Канстанцін Таранаў:

— Калі 10 гадоў таму іх было больш як 200 за год, то летась — усяго 8. А пасля аналізу высветлілася, што не ўсе адносіліся да энергетыкаў. Праблемы міжведамасныя — па транпартаванні, па перадачы цеплаенасьбітаў — былі зняты. Засталіся праблемы па эксплуатацыі саміх дамоў і кватэр: пераабсталяванне, зношанасць... Так здарылася, што ЖКГ, якой было даручана ліквідаваць пасярэдніцкія структуры пры абслугоўванні насельніцтва, сама стала пасярэдніцкай структурай. Праз яе сеткі ідзе транспартаванне цяпла. Таму рабочая група паставіла пытанне аб перадачы гэтых сетак у «Гомельэнерга» — для таго, каб зняць усе пытанні ад вытворцы цяпла да канчатковага спажыўца. Гэта павінна прывесці да зніжэння страт і выключэння розных міжведамасных рознагалоссяў.

Пакуль што ў Гомелі на балансе ЖКГ знаходзіцца каля 460 км цеплавых сетак, хоць іх абслугоўваннем ужо даўно займаюцца энергетыкі. Гэта цягне груз дадатковых страт у выглядзе падаткаў, што ў выніку таксама павялічвае сабекошт канчатковага прадукту. Менавіта таму плануецца перадаць цеплавыя сеткі РУП «Гомельэнерга».

Пераход на сістэму прамых разлікаў насельніцтва за цеплавую энергію ў краіне будзе праходзіць паэтапна да пачатку ацяпляльнага сезона 2015-2016 гадоў. Адначасова плануецца правесці шэраг мерапрыемстваў па аптымізацыі схем цеплазабеспячэння населеных пунктаў, а таксама распрацаваць новы парадак дыферэнцаванай аплаты юрыдычнымі і фізічнымі асобамі за цеплавую энергію.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

■ Парламенцкі дзённік

ПРЫВАТНЫ БІЗНЕС І БЕЛАРУСКАЯ ЧЫГУНКА

Дэпутаты рыхтуюць законапраект, які забяспечыць сумяшчэнне гэтых двух паняццяў

Чыгуначнікам заканадаўча забароняць удзельнічаць у забастоўках; прыватнікі, пры жаданні, змогуць пабудаваць уласныя чыгуначныя пуці, а пры наяўнасці інвестыцый праз тэрыторыю нашай краіны пачнуць хадзіць высокахуткасныя цягнікі. Карэспандэнтка «Звязды» пабывала на пасяджэнні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі і даведалася, што яшчэ прадугледжваецца праектам Закона «Аб унясенні змен і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях чыгуначнага транспарту».

Стажыроўкі замест забастовак

Праект Закона ў першым чытанні Палата прадстаўнікоў плануе разгледзець 2 красавіка.

«Гэтым законапраектам ствараюцца прававыя ўмовы і механізмы недыскрымінацыйнага доступу да паслуг чыгункі, — адзначыў **Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК, старшыня Пастаяннай камісіі.** — Таму карэктуецца існуючая прававая база, уводзіцца шэраг новых паняццяў. Напрыклад, «перавозчык», «нацыянальны перавозчык», «аператар сетак», «спажывец» і шэраг іншых, неабходных для прававога стварэння недыскрымінацыйных умоў. Адпаведна ўводзяцца і дадатковыя нормы, звязаныя з гэтай задачай».

Так, у праекце закона перавозкі падзяляюцца, у адпаведнасці з сусветнай практыкай, на гарадскія, рэгіянальныя, міжрэгіянальныя, міжнародныя і камерцыйныя. Рэгіянальныя і міжрэгіянальныя прапануецца дадаткова падзяліць на «бізнес-клас» і «агульныя вагоны». Такім чынам, можна сказаць, што ідзе ўзаконьванне таго, што ўжо рэалізуецца на практыцы.

Таксама ў праект закона дадаткова будуць уключаны некаторыя патрабаванні да персаналу. У прыватнасці, прапануецца ўвесці норму, якая забараняе ўдзел у забастоўках асобам, што задзейнічаны ў перавозачным працэсе. Таксама да персаналу будуць прад'яўляць патрабаванні, накіраваныя на забеспячэнне іх адпаведнай падрыхтоўкі: павышэнне кваліфікацыі, стажыроўкі...

Як паведаміў парламентарый, праект закона быў распрацаваны з улікам Пагаднення па рэгуляванні доступу да паслуг чыгуначнага транспарту і асноў тарыфнай палітыкі, якое было падпісана 9 снежня 2010 года, а таксама тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза.

Ці прыйдуць прыватнікі на чыгунку?

Сяргей НАВІЦКІ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, падкрэсліў неабходнасць развіцця хуткасных ліній чыгункі, на якіх цягнік мог бы развіваць хуткасць да 350 кіламетраў за гадзіну. Такія чыгуначныя магістралі неабходны, перш за ўсё, для сувязі з буйнымі цэнтрамі Расіі, Украіны, Польшчы, краін Прыбалтыкі. Па словах сенатара, гэта павялічыць пасажырапаток на чыгунцы (за кошт таго, што частка людзей аддасць перавагу хуткасным цягнікам, а не аўта- і авіятранспарту), скароціць стратнасць пасажырскіх перавозак і зменшыць негатыўнае ўздзеянне на экалогію. «Для такіх структурных праектаў — а яны дастаткова дарагія — неабходна прадугледзець механізм фінансавання ва ўмовах прыватнага і дзяржаўнага партнёрства», — заявіў Сяргей Навіцкі.

Сёння беларуская чыгунка — гэта дзяржаўная манаполія. Але паколькі пастаўлена задача развіваць малы і сярэдні бізнес, даводзіць яго ўнёсак у ВУП да 10%, то прадстаўнік Савета Рэспублікі прапануе падумаць пра стварэнне канкурэнтнага асяроддзя на беларускай чыгунцы адразу ў некалькіх кірунках.

Па-першае, гэта лібералізацыя рынку лакаматыўнай тэхнікі. Сяргей Навіцкі лічыць, што можна даць магчымасць прыватным кампаніям набываць лакаматывы, прычым з новымі ўстаноўкамі, і перадаваць іх затым у арэнду «Беларускай чыгункі». Па-другое, сёння ў Беларусі рамонт рухомага саставу таксама манапалізаваны дзяржавай. Таму парламентарый прапануе і тут пераходзіць на рыначныя рынцыпы. Па-трэцяе, у Беларусі няма прыватных перавозчыкаў на чыгунцы. У той жа час у Расіі і Казахстане, у нашых партнёраў па Мытным Саюзе, такая практыка ўжо ёсць. У Расіі ёсць кампанія, якая перавозіць пасажыраў з Дамадзедава ў цэнтр Масквы. Гэта цалкам прыватны перавозчык са сваім рухомым саставам, і ён паказаў сябе дастаткова эфектыўна.

Будуць інвестыцыі — будзе хуткасная магістраль

Каментуючы прапановы парламентарыя, **першы намеснік міністра транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь Яўген РАГАЧОЎ** заўважыў, што калі прааналізаваць вопыт Расійскай Федэрацыі, Казахстана, то «ён сумны». І расійская чыгунка, і казахская прызнаюць тое, што тыя рэформы, па якіх яны пайшлі, адыходзячы ад дзяржаўнай манаполіі, мелі негатыўны эфект для нацыянальнага перавозчыка ў прыватнасці і для дзяржавы ў цэлым.

«Што да хуткаснага руху, то адкажу як прадстаўнік Міністэрства транспарту — мы будзем рады, калі ў нас з'явіцца інвестар, які пабудуе праз Беларусь хуткасную дарогу, — адзначыў прадстаўнік Мінтранса. — Я, як куратар Беларускай чыгункі, падтрымліваю гэта рашэнне, але наколькі важны для Беларусі хуткасны рух? У нас не вельмі вялікая краіна, прытым што мы таксама развіваем і нацыянальнага авіяцыйнага перавозчыка». Між тым Яўген Рагачоў пагадзіўся, што калі такую магістраль мы будзем будаваць як удзельнікі праекта, які звяжа, напрыклад, Маскву і Берлін, то гэта будзе цалкам мэтазгодна. Зноў жа, міністэрства як орган дзяржаўнага рэгулявання такіх сродкаў у сябе ў бюджэце пакуль не бачыць, таму ўся надзея на інвестараў.

«Калі казаць пра перавозкі ў аэрапорты, то міністэрства не супраць, каб тут на чыгунцы з'явіўся прыватны перавозчык, — заўважыў намеснік міністра. — Тым больш што на тэрыторыі аэрапорта мы гатовы ісці на нейкія зрухі, каб ля таго тэрмінала, дзе будзе спыняцца цягнік, пабудаваць нейкія гандлёвыя пункты». Таксама Яўген Рагачоў дадаў, што міністэрства будзе падтрымліваць ідэю прыватнікаў пабудаваць, напрыклад, Палескую чыгунку. «Гэта патрэбна для аграпрамысловага комплексу, для перавозкі пасажыраў», — заявіў ён.

Надзея ЮШКЕВІЧ.

■ Знешнепалітычны вектар

ДЫЯЛОГ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

На чарговым брыфінгу Дзмітрый МІРОНЧЫК, прэс-сакратар беларускага знешнепалітычнага ведамства, расказаў журналістам аб найбольш актуальных на сёння для МЗС пытаннях.

Міністр прамысловасці і рамёстваў Камбоджы тэсціруе першы сабраны ў гэтай краіне трактар «Беларус».

Пасла адазвалі — сувязі засталіся

«Ужо пасля адклікання пасла Украіны з Беларусі ў Кіеў для кансультацый пасол Рэспублікі Беларусь ва Украіне Валянцін Вялічка сустракаўся з першым намеснікам міністра замежных спраў Украіны, — патлумачыў Дзмітрый Мірончык. — Такім чынам, наш дыялог з Украінай працягваецца».

Па словах прэс-сакратара, беларускі бок у любым выпадку сыходзіць з таго, што ўзровень пасла — гэта той узровень, на якім павінны падтрымлівацца стасункі паміж суседнімі сяброўскімі краінамі, што звязаны тысячамі эканамічных, гуманітарных, міжасобасных сувязяў. «Мы спадзяёмся, што менавіта на гэтым узроўні нашы стасункі будуць працягвацца і ў далейшым», — падкрэсліў дыпламат.

Як было аб'яўлена раней, у сувязі з адкліканнем украінскага пасла для кансультацый у Кіеў Міністэрства замежных спраў не бачыць неабходнасці ў аналагічным кроку з беларускага боку.

Расія дапаможа... транзітнымі візамі

Начальнік упраўлення інфармацыі паведаміў пра парадак дня на нядаўніх беларуска-расійскіх кансультацыях па консульскіх пытаннях у Мінску. Краіны абмеркавалі выдачу расійскімі дыпламатычнымі прадстаўнікамі і консульскімі ўстановамі транзітных віз для прыезду ў Мінск падчас чэмпіянату свету па хакеі як афіцыйных удзельнікаў, так і замежных турыстаў, якія маюць права бязвізавага ўезду на беларускую тэрыторыю.

Таксама на кансультацыях гутарка ішла пра стан двухбаковага супрацоўніцтва па консульскіх пытаннях, абароне правоў і інтарэсаў грамадзян Беларусі і Расіі — у тым ліку на тэрыторыях трэціх краін.

Беларускія трактары паедуць па Індакітаі

27 сакавіка ў Камбоджы адкрыўся першы ў Паўднёва-Усходняй Азіі завод па зборцы беларускіх трактароў.

Па інфармацыі прэс-сакратара, гэта адбылося падчас першага ў гісторыі візіту ў Камбоджу міністра замежных спраў Беларусі Уладзіміра Макея. Новы праект павінен на першапачатковым этапе штогод пастаўляць на рынак Камбоджы і суседніх краін больш за 400 трактароў розных мадэляў і магутнасці.

Падчас візіту Уладзімір Макей сустрэўся з міністрам адукацыі, моладзі і спорту Камбоджы. Былі абмеркаваны перспектывы супрацоўніцтва ў галіне навукі і адукацыі, у тым ліку магчымасці падрыхтоўкі камбаджыйскіх спецыялістаў ва ўстановах адукацыі Беларусі.

Інвестары збяруць «ураджай»

З 31 сакавіка па 2 красавіка Беларусь наведае віцэ-прэзідэнт Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця Андраш Шымора. Акрамя сустрэч і перамоў з афіцыйнымі асобамі, віцэ-прэзідэнт плануе пабываць на першым пускавым комплексе швейцарска-беларускага завода па вытворчасці электратранспарту ААТ «Штадлер-Мінск», які знаходзіцца ў горадзе Фаніпаль Мінскай вобласці. Дарэчы, менавіта ў красавіку «Штадлер-Мінск» выпусціць сваю першую прадукцыю.

Як патлумачыў Дзмітрый Мірончык, Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця прымае ўдзел у фінансаванні вышэйназванага праекта. Усяго ў 2013 годзе аб'ём яго аперацый у нашай краіне дасягнуў гістарычнага максімуму ў 255 мільёнаў еўра. Гэтаму ў многім спрыяла прыняцце ў 2013 годзе новай стратэгіі ЕБРР для Беларусі на 2013—2015 гады.

«ШтадлерРэйлГруп» — адзін з вядучых еўрапейскіх вытворцаў чыгуначнага рухомага саставу. Прадукцыя кампаніі эксплуатуецца ў розных краінах свету. На яе прадпрыемствах працуе звыш 4 тысяч чалавек.

Надзея ЮШКЕВІЧ.

НАВІНЫ

НА МАРШРУЦЕ МІНСК — ВІЛЬНЮС З'ЯВЯЦЦА НОВЫЯ ЦЯГНІКІ

Трохвагонныя дызель-цягнікі ДПЗ польскай вытворчасці будуць курсіраваць з 1 мая па маршруце Мінск — Вільнюс. Новыя саставы заменяць дызель-цягнікі ДР, якімі абслугоўваецца састаў №15/16 «Мінск — Вільнюс».

Паводле інфармацыі прэс-цэнтра Беларускай чыгункі, расклад руху цягнікоў №15 і №16, а таксама парадак правядзення пагранічнага і мытнага кантролю застануцца ранейшымі. Па выхадных і святочных днях пры павялічэнні пасажырапатоку цягнік № 15/16 будзе ісці здвоеным саставам.

Два дызель-цягнікі польскай вытворчасці былі пастаўлены на Беларускую чыгунку сёлета і цяпер праходзяць прыёмачныя выпрабаванні. Машыністы, якія будуць працаваць на іх, ужо прайшлі тэарэтычны курс навучання ў Польшчы.

У красавіку на Беларускую чыгунку паступіць трэці дызель-цягнік ДПЗ, як і прадугледжана кантрактам. Даўжыня новых цягнікоў — 69,3 метра, канструкцыйная хуткасць руху — 140 кіламетраў за гадзіну. У іх маецца па 145 месцаў для сядзення. Новы рухомы састаў адпавядае сучасным патрабаванням бяспекі руху і камфорту для пасажыраў. Да іх паслуг прасторныя салоны, мяккія крэслы з магчымасцю індывідуальнага рэгулявання спінкі і падлакотнікаў, паніжаная падлога, якая дазваляе хутка праводзіць пасадку і высадку. У кожным вагоне маецца сістэма кандыцыянавання паветра, ёсць цеплавая заслона ўваходных дзвярэй, якія перашкаджаюць паступленню халоднага паветра звонку і выхаду цёплага з салонаў. Дзверы абсталяваны прыступкамі, якія высоўваюцца. Для пасажыраў з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі прадугледжаны адкідныя трапы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПАДЗЕІ

ЧЭК — ВАШ «ГАРАНТЫЙНЫ ТАЛОН» ДА ЭЛЕКТРОННАГА ПРАЯЗНОГА

Да 1 красавіка на ўсіх станцыях сталічнага метро павінны з'явіцца валідатары — прыстасаванні для счытвання праязных білетаў на бескантактных смарт-картках «Мінсктранс». Але валідатары будуць устанаўлівацца не на кожным турнікеце: ад двух да шасці штук на вестыбюль у залежнасці ад інтэнсіўнасці пасажырапатоку на станцыі.

Аналагічныя прыстасаванні ўжо ўстаноўлены ў наземным пасажырскім транспарце. І прынцып работы валідатараў у метро аналагічны. Бескантактную смарт-картку трэба прыкласці да пазначанага контуру: пасля таго, як на пярэдняй панэлі турнікета загарэлася зялёная стрэлка, можна прайсці на станцыю. Калі ж працягвае гарэць «чырвонае святло», якое суправаджаецца гукавым сігналам, — ходу няма.

Што тычыцца аплаты за праезд у наземным пасажырскім транспарце, то пры ўваходзе ў транспартны сродак пасажыр павінен паднесці картку да ўстройства на адлегласць да 5 сантыметраў. Транспартнікі сцвярджаюць, што картка спрацуе нават тады, калі знаходзіцца ў вашым кашальку. Валідатары размешчаны на поручнях па абодва бакі ад дзвярэй, а побач з пярэднімі дзвярамі — з аднаго боку. Пасля таго, як спрацуюць светлавы і гукавы індыкатары і на экране прыбора з'явіцца слова «аплачана», пасажыр можа не баяцца сустрэчы з кантралёрамі.

Карыснай для пасажыраў будзе і наступная інфармацыя: пакуль сістэма яшчэ да канца не абкатана, лепш захоўваць чэк, які выдаецца пры продажы электроннага праязнога і на якім указваюцца звесткі, занесеныя на смарт-картку. У прыватнасці, у чэку ўказваецца інфармацыя аб тэрмінах дзеяння праязнога дакумента і відах запісаных на картку праязных білетаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ФАКТЫ

ЗНЯЦЬ ПЯРСЦЁНАК ДАПАМАГЛІ РАТАВАЛЬНІКІ

Такая незвычайная дапамога спатрэбілася 26-гадовай жыхарцы Бабруйска, ад імя якой да супрацоўнікаў МНС звярнуўся яе муж.

У жанчыны, якая знаходзіцца ў дэкрэтным водпуску, так ацёк палец, што яна не магла самастойна зняць заручальны пярсцёнак. Ратавальнікі зрабілі гэта з дапамогай спецыяльных кусачкаў. «Гэта той выпадак, калі існуе пагроза здароўю чалавека, — удакладніў **памочнік начальніка Магілёўскага абласнога ўпраўлення МНС Вадзім УРУБЛЕЎСКІ.** — З пачатку года гэта ўжо трэці падобны выезд».

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ПЕРАКУЛІЎСЯ ГРУЗАВІК З ВАЙСКОЎЦАМІ

Гэта здарылася на аўтадарозе Магілёў — Касцюковічы. Як паведаміла афіцыйная прадстаўніца УСК па Магілёўскай вобласці Аксана Салянюк, вайскоўцы в/ч 6713 ехалі на ваенны палігон на плановыя стрэльбы.

Вадзіцель «Жыгулёў» паспрабаваў абагнаць «КамАЗ», але не разлічыў хуткасць, і яго легкавік апынуўся пад коламі вайсковай машыны. Грузавік, у якім знаходзіліся 38 вайскоўцаў, перакуліўся. Траўмы рознай ступені цяжкасці атрымалі 33 чалавекі, кіроўца «Жыгулёў» і адзін з вайскоўцаў знаходзяцца ў цяжкім стане. Пацярпелыя шпіталізаваны ў бальніцы Чавус і Магілёва. Падрабязнасці гэтага здарэння разглядаюцца ў рамках крымінальнай справы (артыкул 317, частка 2), прызначаны шэраг экспертыз.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

РАГУЛЯ Ў СКЛЕПЕ

У Барысаўскім раёне работнікі МНС выратавалі карову, якая правалілася ў склеп.

Здарэнне адбылося ў вёсцы Лошніца. У службу выратавання патэлефанавала гаспадыня жывёлы. Як высветлілася, у драўляным хляве, дзе размяшчалася карова, пад драўлянай падлогай быў склеп глыбінёй два метры, абкладзены цэглай. Падлога пракруцілася і не вытрымала цяжару жывёлы. Пасля выратавання рагуля ў ветэрынарнай дапамозе патрэбы не мела.

Сяргей РАСОЛЬКА.

«СМЕШНЫЯ» САНКЦЫІ

Як вядома, пасля рэферэндуму ў Крыме і ўключэння яго як новага рэгіёна ў склад Расіі ЗША, ЕС і некаторыя іх саюзнікі ўвялі санкцыі супраць Расійскай Федэрацыі. Сэнс санкцый заключаўся ў забароне ўезду на тэрыторыю заходніх краін двух дзясяткаў палітыкаў з Расіі і пагрозе арыштаваць іх актывы, калі такія будуць выяўлены. Амерыканскія санкцыі аказаліся крыху больш строгімі, чым санкцыі ЕС. Яны ахапілі больш высокапастаўленых палітыкаў, чым еўрапейскія, і да таго ж амерыканцы адважыліся ўвесці санкцыі супраць пятнаццатага па памеры ў краіне банка «Расія», у сувязі з чым нязначна пацярпеў ён сам і некалькі звязаных з ім дробных банкаў. Пры гэтым расійская дзяржава абяцала дапамагаць грамадзянам Расіі і камерцыйным суб'ектам, якія апынуліся пад санкцыямі. Цікава, што санкцыі супраць прэзідэнта Расіі заходнія краіны ўвесці не асмеліліся. У выніку ўвесь мінулы тыдзень як расійская, так і заходняя прэса кпіла са смехатворнасці санкцый, а расійская біржа ў асноўным «расла».

Да таго ж пытанне аб санкцыях спецыфічнае. Што атрымала Расія за два дзесяцігоддзі падпарадкавання амерыканцам у аднаполярным свеце, чаго зараз можа пазбавіцца? Сучасныя тэхналогіі з заходніх краін Расіі здабыць не лягчэй, чым Кітаю або Індыі, а перадавыя савецкія тэхналогіі былі скуплены Захадам за бясцэнак яшчэ ў 1990-я. Многія вядучыя расійскія навукоўцы перакуплены і «паднімаюць» навуку ў заходніх лабараторыях. У расійскія ж лабараторыі патоку заходніх навукоўцаў не назіраецца.

Былыя саюзнікі Расіі па Арганізацыі Варшаўскага дагавора амаль пагалоўна сталі членамі НАТА, нягледзячы на абяцанне Біла Клінтана не рабіць гэтага. У НАТА спрабуюць уключыць Украіну і Грузію, што неверагодна ўскладніць геапалітычныя пазіцыі Расіі.

Захад — толькі невялікая частка свету, які імкліва глабалізуецца, а візавыя санкцыі супраць Беларусі ўжо даказалі адсутнасць усякай эфектыўнасці пры прымяненні іх супраць нацыянальных дзяржаў.

Амерыканскія і еўрапейскія кампаніі паспяхова ажыццяўляюць экспансію на расійскім рынку, выцясняючы расійскіх вытворцаў. Вынікам членства Расіі ў Сусветнай гандлёвай арганізацыі сталі лепшыя магчымасці пранікнення на расійскі рынак заходніх кампаній, таму выключэнне яе адтуль ударыць перш за ўсё па Захадзе.

Адзінае «дасягненне» пасля краху СССР — утварэнне так званай «васьмёркі» (G-8) з ранейшай «сямёркі» (G-7). Але «васьмёрка» стваралася не з мэтай павелічэння геапалітычнай магутнасці Расіі, а з мэтай узмацнення заходнімі краінамі кантролю за яе знешняй палітыкай і адсячэння ад патэнцыяльных антызаходніх саюзнікаў. Выхад з «васьмёркі» значна палепшыць адносіны Расіі з Кітаем і Індыяй, якія заходнімі краінамі ў гэтую арганізацыю наўмысна ўключаны не былі, нягледзячы на іх велізарны патэнцыял, з мэтай рэалізацыі старажытнай тактыкі «падзяляй і пануй». Таму выключэнне Расіі з «васьмёркі» зноў жа б'е па краінах Захаду, паляпшаючы расійскія адносіны з Індыяй і Кітаем.

Немагчыма таксама пераканаць еўрапейскія краіны не купляць у Расіі газ і нафту, каб пакараць яе эканамічна. Ва ўмовах крызісу такія паводзіны былі б для краін ЕС самагубнымі. Усе энергарэсурсы, якія заходнія краіны адмовяцца купляць у Расіі, будуць з удзячнасцю набыты незаходнімі краінамі, якія маюць патрэбу ў іх, а эканомікі многіх з іх развіваюцца хутчэй за заходнія. Несумненна, за меншую цану. Але гэта пацягне рост расійскага ўплыву ў гэтых краінах, што для Захаду, зноў жа, немэтазгодна.

На справе Расіі нават было б выгадна скарачэнне даходаў ад экспарту энергарэсурсаў, паколькі гэта прымусіла б яе кіраўніцтва задумацца аб рэанімацыі «ўсохлага» за гады сяброўства з Захадам прамысловага патэнцыялу. Прапановы, якія гучаць з вуснаў шэрагу палітыкаў Захаду, зрабіць больш жорсткім візавы рэжым, эфектыўнымі ніяк не назавеш. Захад — толькі невялікая частка свету, які імкліва глабалізуецца, а візавыя санкцыі супраць Беларусі ўжо даказалі адсутнасць усякай эфектыўнасці пры прымяненні іх супраць нацыянальных дзяржаў. Узмацненне жорсткасці візавага рэжыму ў адказ Расіяй ударыць больш балюча па заходнім бізнесе, які бачыць у Расіі незлічоныя магчымасці эфектыўных капіталаўкладанняў.

Што можна чакаць у будучыні, калі сітуацыя ва Украіне ўсё ж стабілізуецца і далейшага абвастрэння адносін у Расіі з Захадам не адбудзецца? Істэрыка з нагоды лёсу Крыма ў гэтым выпадку заціхне на працягу некалькіх месяцаў, і заходнім краінам прыйдзецца асцярожна аднаўляць пастаўленыя пад пагрозу адносіны з Расіяй. Таму што яны выгадныя перш за ўсё ім, а не ёй. Дзесяцігоддзямі захопліваючы расійскі рынак, заходнія кампаніі атрымалі і разлічваюць атрымліваць каласальныя выгады і далей.

Калі ж сітуацыя з Украінай будзе абвастрацца і Расія выкарыстае далейшыя формы канфрантацыі з Захадам у сувязі з лёсам Украіны, магчымае ўзмацненне эканамічных санкцый Захаду супраць Расійскай Федэрацыі з-за неабходнасці захавання твару заходнім светам. У гэтым выпадку, усё, што трэба зрабіць Расіі, — гэта пусціць пастаўшчыкоў з Кітая на месца заходніх вытворцаў. Кітай ужо вядомы як найбуйнейшы прамысловы цэнтр сучаснага свету, і ў ім вырабляюць практычна ўсё, што можа Расіі спатрэбіцца. А газ і нафта, якія адмовіцца з часам купіць ЕС (прычым на сур'ёзнае скарачэнне паставак спатрэбіцца некалькі гадоў), могуць быць кітайцам жа і пастаўлены. Але, каб зноў не патрапіць у падобную сітуацыю, Расіі трэба як след падумаць і пра адраджэнне прамысловага патэнцыялу ў рамках еўразійскіх інтэграцыйных утварэнняў.

Сяргей КІЗІМА,
доктар палітычных навук.

белагропромбанк
традиции будущего

ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ) «СИСТЕМА СБЕРЕЖЕНИЙ ЛИНИЯ РОСТА 2.0»

с 28 марта 2014 года

% годовых

Сумма депозита, ед. валюты	Сроки			
	до 6 месяцев 90-180 дней	от 6 месяцев до 1 года 181-370 дней	от 1 года до 2 лет 371 – 740 дней	от 2 до 5 лет 741 – 2000 дней
Белорусские рубли				
1–10 000 000	45,00	46,00	47,00	47,30
10 000 001–50 000 000	45,10	46,10	47,10	47,40
50 000 001 и более	45,20	46,20	47,20	47,50
Доллары США, Евро				
1 – 500	4,80	5,20	6,00	6,30
501 – 5 000	4,90	5,30	6,10	6,40
5 001 и более	5,00	5,40	6,20	6,50
Российские рубли				
1 – 15 000	8,40	8,80	9,10	9,30
15 001 – 150 000	8,50	8,90	9,15	9,40
150 001 и более	8,60	9,00	9,20	9,50

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
время работы Контакт-Центра Банка
8.00–20.00 – рабочие дни
8.00–18.00 – выходные и праздничные дни
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 14.06.2013 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

ОАО «Белинвесткапитал» финансовые результаты деятельности общества за 2013 год

Показатель		на 01.01.14	на 01.01.13
Выручка от реализации товаров, продукции, работ и услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей)	млн руб.	3 363	2 861
Себестоимость реал.товаров, продукции, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию	млн руб.	425	1 222
Прибыль (убыток) за отчетный период, всего	млн руб.	3 139	1 922
в том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции(работ, услуг)	млн руб.	2 938	1 639
в том числе: прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов	млн руб.	0	9
в том числе: прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов	млн руб.	201	274
Налоги и сборы, платежи и расходы, производимые из прибыли	млн руб.	0	0
Чистая прибыль	млн руб.	3 139	1 922
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	млн руб.	0	0
Просроченная дебиторская задолженность (долгосрочная)	млн руб.	359	77
Просроченная кредиторская задолженность (долгосрочная)	млн руб.	140	68
Обеспеченность акций имуществом общества	тыс. руб.	33 876	30 292

Директор управляющей организации М.Б. Лазарчик Гл. бухгалтер А.А. Савельева УНП 190762007

■ Шляхамі Першай сусветнай

«ПА АБЕДЗВЕ ЛІНІІ ФРОНТУ»

Дзяржаўны музей Першай сусветнай вайны будзе створаны ў Вілейцы

100-годдзе з дня пачатку Першай сусветнай вайны — гэта, натуральна, дата не юбілейная, а трагічная. Аднак знакавыя падзеі, якія адбыліся ў тыя часы, варта прыгадаць, каб аддаць даніну памяці тым, хто загінуў і не быў ушанаваны, каб гэтая старонка гісторыі нашай зямлі больш не была ў цені. Менавіта таму быў створаны арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы і правядзенні мерапрыемстваў, прысвечаных пачатку Першай сусветнай вайны, на чале з намеснікам прэм'ер-міністра Беларусі Анатолем Тозікам. Калекцыянер і грамадскі дзеяч Уладзімір ЛІХАДЗЕДАЎ, які прымаў удзел у пасяджэнні аргкамітэта, расказаў карэспандэнту «Звязды», якім чынам плануецца ўзгадаць падзеі трагічныя і слаўныя.

— Адзіны ў Беларусі музей Першай сусветнай вайны дагэтуль існаваў толькі ў вёсцы Забароддзе Вілейскага раёна, і тое на грамадскіх пачатках...

— Так, ён быў створаны мастаком Барысам Цітовічам і яго аднадумцамі. Аднак я звярнуўся да старшыні Мінскага аблвыканкама Сямёна Шапіры, намесніка прэм'ер-міністра Анатоля Тозіка, і імі было вырашана, што дзяржаўны музей Першай сусветнай вайны будзе створаны на базе Вілейскага краязнаўчага музея. Туды абсалютна бясплатна перададуць усю экспазіцыю з Забароддзя — цяпер яна знаходзіцца ў музеі-капліцы, аднак усё сабранае там не змяшчаецца. Капліца, верагодна, пачне выконваць сваю непасрэдную функцыю, у ёй застанецца толькі частка калекцыі, прысвечаная духоўным асобам, якія мужна змагаліся, лячылі людзей у тыя няпростыя часы. Акрамя таго, музей у Забароддзі набудзе каштоўнасць як гісторыка-ландшафтная зона. Плануецца прывесці ў парадак рэшткі лазарэта і могілкі салдат рускай імператарскай арміі, якія знаходзяцца непадалёк, у лесе.

— Якія экспанаты асабіста вам падаюцца найбольш цікавымі?

— Гэта зброя, якая выкарыстоўвалася падчас газавых атак, сродкі аховы органаў дыхання ад уздзеяння шкодных рэчываў. Таксама медыцынскае абсталяванне, якое выкарыстоўвалася не толькі для лячэння, але і для дэзінфекцыі. Гэта прадметы ўзбраення, побыту, якія адлюстроўваюць змаганне і мірнае жыццё абодвух варагуючых бакоў.

— У самой Вілейцы ці плануецца праводзіць якія-небудзь работы?

— На вілейскіх гарадскіх могілках пахавана 300 салдат, якія загінулі падчас Першай сусветнай. Адшукаць іх імёны, устанавіць надмагільныя знакі не так проста, бо над імі цяпер знаходзіцца пласт надзахаванняў. Нягледзячы на гэта, 250 імёнаў салдат ужо высветлены. Як помнік гэтым воінам на ўваходзе на могілкі будзе пабудавана брама-капліца, на якой напішуць іх імёны. Ужо заліты фундамент, аднак сродкі на пабудову яшчэ збіраюцца. Таксама будзе закладзена алея трох войнаў: вайны з Напалеонам, Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў.

99% маіх паштовак, якія адлюстроўваюць беларускую гісторыю, набыты за мяжой, многія з іх захаваліся ў адзіным экземпляры.

— Ці плануецца запрашаць міжнародную супольнасць для ўшанавання падзей нашай агульнай гісторыі?

— У кастрычніку будзе праведзена міжнародная навуковая канферэнцыя пад назвай «Першая сусветная вайна ў гістарычных лёсах Еўропы». Яе арганізоўваюць Міністэрства інфармацыі, Нацыянальная акадэмія навук Беларусі і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Прыедуць удзельнікі больш чым з 10 краін — усяго каля 150 чалавек. Яны будуць мець магчымасць не толькі абмеркаваць і даць сваю ацэнку тым падзеям, але і наведаць памятныя месцы ў Вілейскім, Смаргонскім і Мядзельскім раёнах.

— Якія найбольш значныя ваенныя дзеянні, на вашу думку, варта прыгадаць?

— Свянцянскі прарыў 1915 года — гэта нямецкая наступальная аперацыя, калі ўдалося захапіць Вілейку, разбурыць Смаргонь. Аднак вялікага плёну гэта не прынесла, праз пэўны час германцы былі зноў адкінуты назад. У 1916 годзе адбыліся дзве значныя наступальныя аперацыі рускай імператарскай арміі — Нарачанская і Баранавіцкая. Яны былі распачаты нашым камандаваннем, каб падтрымаць Заходні фронт, на якім вяліся жорсткія баі, і адцягнуць на сябе частку сіл ворага. Да важных падзей на нашай тэрыторыі адносяцца таксама размяшчэнне Стаўкі вярхоўнага галоўнакамандуючага спачатку пад Баранавічамі, а потым і ў Магілёве, таксама падпісанне Брэст-Літоўскага мірнага дагавора. Памятныя месцы, на якіх адбываліся ўсе гэтыя падзеі, так ці іначай захаваліся, таму ў бліжэйшыя гады яны не застануцца без увагі.

— Некалькі гадоў таму ў вас выйшла кніга пад назвай «Беларусь праз аб'ектыў нямецкага салдата. 1915—1918»...

— Раней мы ведалі пра падзеі Першай сусветнай вайны толькі з пункту гледжання рускай арміі. Аднак цяпер, дзякуючы старым паштоўкам і фотаздымкам, якія мне ўдалося сабраць, мы можам глядзець на ўсё таксама вачыма нямецкага салдата. Да таго ж рускія вайскоўцы менш фатаграфавалі, а немцы рабілі здымкі пастаянна. Калі лічыць, што кожны дзень яны адпраўлялі сваім родным, сябрам па адной паштоўцы, то атрымліваецца вялізная колькасць. Быў у гэтым і элемент прапаганды: яны фатаграфавалі завяваныя тэрыторыі, разбураныя стратэгічныя аб'екты, пісалі пра гэта на радзіму. Часта па іх паштоўках можна вывучаць побыт беларусаў, глядзець, як жыла вёска, простыя людзі. Асобны, пакуль не даследаваны пласт інфармацыі змяшчае адваротны бок паштовак, на якім, нягледзячы на цэнзуру таго часу, можна прачытаць шмат такога, што пралье святло на многія падзеі... Частку паштовак гэтага часу я планую перадаць у новы музей Першай сусветнай вайны ў Вілейцы. Дарэчы, цяпер рыхтую новае выданне, рабочая назва якога «Беларусь. Імгненні Першай сусветнай. Па абедзве лініі фронту».

— Як вы збіраеце сваю калекцыю?

— Магу сказаць, што 99% паштовак, якія адлюстроўваюць беларускую гісторыю, набыты за мяжой, многія з іх захаваліся ў адзіным экземпляры. Аднак цяпер фотаздымкаў часоў Першай сусветнай вайны трапляецца ўсё менш: большасць ужо «асела», трапіла да пэўных калекцыянераў. Старая паштоўка для мяне — гэта надзвычай каштоўнае сведчанне гісторыі. Бо да яе нічога нельга дадаць ці прыдумаць — з візуальнай выявай не паспрачаешся. Таму яе можна лічыць найбольш аб'ектыўнай крыніцай гістарычнай інфармацыі. Тут не ўдасца падмануць або выказаць уласнае меркаванне, якое не адпавядае ісціне, — усё можна ўбачыць на свае вочы.

— Ці можна сказаць, што Першая сусветная вайна істотна адрознівалася ад Вялікай Айчыннай вайны?

Немцы знішчылі Смаргонь дзён за 10, зрабілі «мёртвым» горадам — гэта адзін з нешматлікіх такіх жудасных выпадкаў у гісторыі.

— Так, адбылося некалькі значных баёў, пра якія мы ўжо казалі, аднак у 1915 годзе лінія фронту замацавалася на нашай тэрыторыі і больш амаль не рухалася. Былі і разбураныя населеныя пункты, сярод якіх Слонім, Відзы, Паставы... Часам сама руская армія разбурала некаторыя стратэгічныя аб'екты, адступаючы: напрыклад, вакзалы і масты ў Пінску, Гродне, Брэсце. Існуе міф пра 810 дзён супрацьстаяння горада Смаргоні, але насамрэч немцы знішчылі яго дзён за 10, зрабілі «мёртвым» горадам — гэта адзін з нешматлікіх такіх жудасных выпадкаў у гісторыі. Убачыўшы спустошанасць, нават варожая армія зразумела, што трымацца за гэтае месца не мае сэнсу. Аднак у астатнім лінія фронту была пастаяннай. Нямецкія салдаты часам жылі ў хатах беларускіх вяскоўцаў, нават стваралі сем'і і нараджалі дзяцей. Тое ж можна сказаць і пра салдат рускай арміі, якія кантактавалі з мясцовым насельніцтвам... Спадзяюся, што мерапрыемствы, якія будуць праводзіцца ў памяць пра трагічныя даты, дапамогуць адкрыць і гэтыя малавядомыя раней старонкі нашай гісторыі.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.
Фота Надзеі БУЖАН.
Паштоўкі з асабістага архіва Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА.

Паштоўка. Вакзал у Смаргоні.

